# ПРЭСА БССР АБ РАЗВІЦЦІ РАДЫЁВЯШЧАННЯ Ў 1920-я гг.

***М. В. Прахарэня***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*prakhar@bsu.by*

У матэрыяле на аснове публікацый друкаванай прэсы паказаны канкрэтныя аспекты развіцця радыёвяшчання ў БССР у 1920-я гг. Устаноўлена, што друкаваныя СМІ не толькі папулярызавалі ідэю радыёфікацыі, але і ўказвалі на праблемы, звязаныя з арганізацыяй радыёвяшчання ў дадзены гістарычны перыяд.

***Ключавыя словы:*** прэса БССР; радыёвяшчанне БССР; Мінская радыёстанцыя; «Звезда»; «Рабочий».

# ПРЕССА БССР О РАЗВИТИИ РАДИОВЕЩАНИЯ В 1920-Е ГГ.

***М. В. Прохореня***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*prakhar@bsu.by*

В материале на основе публикаций печатной прессы показаны конкретные аспекты развития радиовещания в БССР в 1920-е гг. Установлено, что печатные СМИ не только популяризировали идею радиофикации, но и указывали на проблемы, связанные с организацией радиовещания в данный исторический период.

***Ключевые слова:*** пресса БССР; радиовещание БССР; Минская радиостанция; «Звезда»; «Рабочий».

1920-я гг. сталі перыядам станаўлення рэгулярнага радыёвяшчання на тэрыторыі нашай краіны. Менавіта ў гэты час ўдасканальваліся тэхнічныя сродкі для радыёсувязі, пашыралася матэрыяльная база,

адбываўся пошук форм вяшчання, вялася радыёфікацыя рэспублікі. Згодна з планам агульнасавецкага радыёбудаўніцтва 15 лістапада 1925 г. пачала сваю дзейнасць Мінская радыёстанцыя імя Саўнаркама БССР. З гэтага часу радыё стала важнай часткай жыцця беларускага грамадства, яго культуры и быта.

Прэса 1920-х гг. актыўна асвятляла працэс развіцця радыёвяшчання, адлюстроўваючы не толькі практычныя дасягненні, але і цяжкасці, звязаныя з укараненнем радыё ў жыццё беларускага грамадства. Друкаваныя СМІ папулярызавалі ідэю радыёфікацыі як важнай часткі культурнай рэвалюцыі, публікавалі матэрыялы, дзе падкрэслівалася роля радыё ў ліквідацыі непісьменнасці, пашырэнні адукацыі, павышэнні палітычнай і грамадзянскай свядомасці працоўных і сялян.

На працягу 1920-х гг. рэдакцыі друкаваных выданняў звярталі пільную ўвагу на практычныя крокі па развіцці радыёвяшчання. Газеты падрабязна інфармавалі чытачоў пра будаўніцтва і ўвод у эксплуатацыю радыёстанцый на тэрыторыі БССР, расказвалі пра іх магутнасць, зоны ахопу і планаваныя праграмы вяшчання. Газета «Звезда» 17 лістапада 1925 г. паведамляла: «Минская станция охватывает радиусом своего действия 300 верст. Все места в Беларуси будут, таким образом, обслужены. Даже Смоленск и Гомель воспринимают работу нашей станции… Вся установка обошлась в 25 тыс. рублей». У матэрыяле адзначалася, што ў гэты час у Мінску было каля 400 індывідуальных радыёпрыёмнікаў і 20 клубных установак з гучнагаварыцелямі, кожная з якіх разлічана на аўдыторыю прыблізна 200 чалавек [1].

У чэрвені 1928 г. газета «Рабочий» пісала, што радыёвяшчанне ў БССР вядзецца праз моцны перадатчык у г. Мінску і Гомельскую радыёстанцыю сярэдняй моцнасці. Паведамлялася аб тым, што беларускія радыёперадачы прымаюцца на Урале, у Крыму, у Ленінградзе і інш. Адзначалася, што ў хуткім часе будзе праходзіць радыёфікацыя хат-чытальняў, клубаў. Арганізацыя радыёвяшчання ў найбольш населеных гарадах БССР (Мінска, Гомеля, Віцебска) планавалася шляхам устаноўкі трансляцыйных вузлоў, што тлумачылася іх больш танным коштам у параўнанні з вытворчасцю самастойных радыёўстановак. Акрамя таго, чытачам дэтальна тлумачылася, як будзе праходзіць радыёфікацыя сельскай мясцовасці, дзе пакуль пражывала большасць насельніцтва БССР, падкрэслівалася роля радыё ў культурным жыцці вёскі [2].

Прэса БССР актыўна асвятляла стварэнне радыёвузлоў на фабрыках і заводах, апісвала арганізацыю калектыўнага праслухоўвання радыёпе-

радач у працоўных калектывах. Напрыклад, у лістападзе 1929 г. газета «Рабочий» паведаміла пра арганізацыю радыёвяшчання на шклозаводзе «Кастрычнік». Так, устаноўка абсталявання каштавала 7 тыс. рублёў (для гэтага кожны рабочы прадпрыемства адлічыў адзін штодзённы заробатак), у эфіры была трансляцыя радыёгазеты, канцэртаў, гучалі лекцыі, а таксама агульназаводская інфармацыя [3].

Амаль ва ўсіх цэнтральных газетах існавала рубрыка «Радыёаматар», дзе расказвалася аб вытворчасці і распаўсюджванні радыёпрыёмнікаў, асвятляліся спробы арганізацыі радыёсувязі з блізкім і далёкім замежжам, называліся асаблівасці вытворчасці радыёдэталяў і прыёмнікаў на прамысловых прадпрыемствах БССР, паведамлялася аб кошце радыёпрыёмнікаў і ўмовах іх набыцця, у тым ліку шляхам ільготнага крэдытавання.

У газетах «Звезда», «Рабочий» і акруговых выданнях «Камуністычны шлях» (Аршанская акруга), «Віцебская сялянская газета» (Віцебская акруга), «Наш працаўнік» (Калінінская акруга), «Савецкая вёска» (Мазырская акруга), «Полоцкий пахарь» (Полацкая акруга) публікавалася праграма перадач Мінскай радыёстанцыі. У 1920-я гг. у эфіры гучалі радыёгазеты, лекцыі па аграноміі, ветэрынарыі, медыцыне і іншых галінах ведаў, трансляваліся канцэрты, спектаклі, оперы. У чэрвені 1926 г. «Звезда» анансавала цыкл радыёлекцый па фізічнай культуры, а таксама пачатак трансляцыі штотыднёвай радыёперадачы для сялян, куды ўвайшлі гутаркі па пытаннях аховы здароўя, сельскай гаспадаркі, ліквідацыі непісьменнасці, канцэртныя праграмы і інш. [4].

З мэтай папулярызацыі радыё ў сельскай мясцовасці былі наладжаны сумесныя выезды радыёперасоўкі і кінапраектара. Да пачатку кінасеанса вясковая аўдыторыя слухала даклады, лекцыі, выпускі радыёгазет, тэматычныя канцэрты і такім чынам знаёмілася з кантэнтам Мінскай радыёстанцыі. Затым радыёўстаноўка выкарыстоўвалася як транслятар гуку падчас кінасеанса. Гэты падыход ствараў эфект «жывога ўзаемадзеяння» аўдыторыі з тагачаснымі новымі тэхналогіямі. Як паведамляла газета «Рабочий» у матэрыяле «Радио и кино», музычнае суправаджэнне кінафільмаў праз радыё паляпшала ўспрыманне кінафільмаў, дэманстравала сінергію аўдыявізуальных сродкаў камунікацыі [5].

Тым не менш, нягледзячы на актыўную папулярызацыю радыё, друкаваныя выданні не замоўчвалі і пра цяжкасці, звязаныя з арганізацыяй радыёвяшчання ў БССР. Напрыклад, газета «Звезда» называла прабле-

мы, звязаныя з нізкай якасцю радыёсігнала. Слухачы былі незадаволены якасцю маскоўскай трансляцыі – «бой часов с Красной площади едва слышен», «трансляция передается с переменной слышимостью между Р1-Р5 (по 9-балльной шкале слышимости), тогда как передача Минская имеет слышимость Р8, т. е. очень громкую» [6]. У адным з матэрыялаў рэдакцыя газеты «Рабочий» ўказавала на такія недахопы ў рабоце Мінскай радыёстанцыі, як неарганізаванае правядзенне канцэртаў, абмежаваны і аднастайны музычна-вакальны рэпертуар, малую колькасць падрыхтаваных радыёжурналістаў, тэхнікаў і спецыялістаў па абслугоўванні радыёапаратуры [7].

Адзначым, што нярэдка здараліся выпадкі недобрасумленнага стаўлення да справы радыёфікацыі з боку тэхнічных спецыялістаў. Дадзены аспект таксама быў адлюстраваны на старонках друкавай прэсы. Так, газета «Звезда» пісала пра кінамеханіка Фірсанава. Ён ажыццяўляў установку гучнагаварыцеляў па завышаным кошце, але якасць аказаных паслуг была нізкай: «В Белбумтресте он взял за установку громкоговорителя 1800 руб., а результате громе глухого ворчанья ничего не слышно», – паведамлялася ў матэрыяле «Тысячи – на радиоветер» [8].

Такім чынам, прэса БССР у 1920-я гг. адыграла важную ролю ў папулярызацыі радыё як важнага інструмента сацыяльнага і культурнага будаўніцтва. Яна не толькі інфармавала пра дасягненні і планы ў галіне радыёфікацыі, але і актыўна ўплывала на фарміраванне грамадскай думкі, падкрэсліваючы ідэалагічнае значэнне радыё і заклікаючы да яго шырокага выкарыстання ў жыцці беларускага грамадства. Вывучэнне матэрыялаў прэсы дазваляе ўявіць маштаб і складанасць працэсу развіцця радыёвяшчання БССР у 1920-я гг.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Открытие в Минске широковещательной радиостанции // Звезда. 1925. 17 ноября.
2. Радиофикация БССР // Рабочий. 1928. 9 июня.
3. Радиофицированный завод // Рабочий. 1929. 5 ноября.
4. Радио // Звезда. 1926. 19 июня.
5. Радио и кино // Рабочий. 1927. 21 августа.
6. Радиолюбители о Минской радиостанции // Звезда. 1926. 22 мая.
7. Ненормальности на радиостанции должны быть прекращены // Рабочий. 1928. 20 апреля.
8. Тысячи – на радиоветер // Звезда. 1926. 9 мая.